БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ГІСТОРЫКАЎ

# ГІСТАРЫЧНАЯ НАВУКА І ГІСТАРЫЧНАЯ АДУКАЦЫЯ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ: СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

Матэрыялы II Усебеларускай канферэнцыі гісторыкаў

Мінск, 10 – 11 красавіка 1997 г.

БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ГІСТОРЫКАЎ

# ГІСТАРЫЧНАЯ НАВУКА І ГІСТАРЫЧНАЯ АДУКАЦЫЯ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ: СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ

**Матэрыялы II Усебеларускай канферэнцыі гісторыкаў**

**Мінск, 10 – 11 красавіка 1997 г.**

МІНСК
БДУ
1999

УДК [947.6 + 37:93(476)] (043.2)
ББК 63.3 (4 Беи)
Г 46

Р э д а к ц ы й н а я к а л е г і я :

*М.П.Касцюк* (галоўны рэдактар), *І.В.Аржахоўскі, М.В.Біч, М.К. Кошалеў, У.С.Кошалеў, У.Ф.Ладысеў, П.А.Лойка, У.В.Ляхоўскі, У.І.Навіцкі, В.Н.Рабцэвіч, У.Н.Сідарцоў, У.Е.Снапкоўскі, В.М.Фамін, Г.В.Штыхаў.*

**Гістарычная** навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь:
Г 46 стан і перспектывы развіцця: Матэрыялы II Усебел. канф. гісторыкаў, Мінск, 10 – 11 крас. 1997 г. /М.П. Касцюк, У.Н.Сідарцоў, В.А.Фядосік і інш. – Мн.: БДУ, 1999. – 357 с.
ISBN 985-445-251-4.

У зборніку змешчаны матэрыялы II Усебеларускай канферэнцыі гісторыкаў «Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: стан і перспектывы развіцця», арганізаванай па ініцыятыве Беларускай асацыяцыі гісторыкаў, якая аб'ядноўвае вядучых вучоных гэтай галіны ведаў, выкладчыкаў ВНУ, архіўных, музейных работнікаў, тых, хто прафесійна займаецца пытаннямі гісторыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Разлічана на шырокае кола чытачоў, усіх, хто цікавіцца пытаннямі гісторыі Беларусі.

**УДК [947.6 + 37:93(476)] (043.2)**
**ББК 63.3 (4 Беи)**

**ISBN 985-445-251-4** © БДУ, 1999

**А. М. Вабішчэвіч**
кандыдат гістарычных навук (Брэст)

# ДЗЕЙНАСЦЬ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921 – 1939)

Акрамя сялянскага, рабочага руху, палітычных партый адметнае месца ў нацыянальна-вызваленчай барацьбе Заходняй Беларусі ў 20 – 30-я гады займалі культурна-асветныя арганізацыі. Менавіта яны праз сістэму гурткоў, бібліятэк-чытальняў, самадзейных калектываў, нешматлікіх гімназій і пачатковых школ, друк выступалі супраць паланізацыі, абуджалі нацыянальную і грамадскую свядомасць беларускага насельніцтва. Вялікі ўклад у гэтую справу ўнесла Таварыства беларускай школы (1921 – 1936). Найперш аўтарытэт ТБШ узмацняўся ў ходзе школьных кампаній. Да 1928 г. агульная колькасць дэкларацый аб адкрыцці беларускіх школ перавысіла 30 тыс.[1] З-за паўсюдных перашкод з боку польскіх улад рэальныя вынікі школьнай акцыі былі сціплыя, аднак таварыства працягвала настойліва змагацца за этнічнае самазахаванне насельніцтва.

Уздым вызваленчай барацьбы ў сярэдзіне 20-х гадоў, які быў выкліканы дзейнасцю Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ) і КПЗБ, спрыяў пераўтварэнню ТБШ у самую масавую і ўплывовую культурна-асветную арганізацыю. У сярэдзіне 1928 г. налічвалася 430 гурткоў, што аб'ядноўвалі не менш за 14 – 15 тыс. чалавек.

Разам са станаўленнем таварыства ў 1926 г. узнікла альтэрнатыўная арганізацыя – Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры (БІГіК). Дзеячы БІГіК, якія прытрымліваліся нацыянальна- і хрысціянска-дэмакратычных поглядаў, таксама шмат зрабілі ў супрацьдзеянні паланізацыі. БІГіК пашыраў свой уплыў сярод беларусаў-католікаў Віленшчыны і Навагрудчыны. У пачатку 1927 г. дзейнічалі 50 гурткоў (каля 800 членаў), 22 бібліятэкі БІГіК. Супярэчнасці гэтай арганізацыі з ТБШ не дазволілі аб'яднаць намаганні ў школьным пытанні.

Палітычныя аспекты ў працы культурна-асветных арганізацый, асабліва ТБШ, па меры разгортвання вызваленчай барацьбы набылі важнае значэнне. Імкненне да палітызацыі работы таварыства, за што выступалі камуністы, прадстаўнікі беларускага пасольскага клуба «Змаганне», было вынікам узмацнення рэвалюцыйна-дэмакратычных настрояў у заходнебеларускім грамадстве. Аднак ва ўмовах ганенняў з боку польскага рэжыму «санацыі» ў канцы 20-х гадоў варта было стрымлівацца ад празмернай палітызацыі, каб захаваць легальны характар ТБШ. Нягледзячы на раскол у кіраўніцтве, у канцы жніўня 1929 г. пасля года сваёй забароны галоўная ўправа таварыства ўсё такі атрымала магчымасць на легальнае існаванне. Адсутнасць узаемаразумення, барацьба за ўплыў паміж рознымі палітычнымі сіламі нярэдка перашкаджалі эфектыўнасці ў працы нізавых структур.

---

[1] НА РБ, ф. 833, воп. 1, спр. 112, арк. 2.

Паланафільскія арганізацыі (Беларуская Часовая Рада, таварыства «Прасвет» і інш.) не маглі скласці сур'ёзнай канкурэнцыі ТБШ і БІГіК. Не маглі атрымаць шырокай падтрымкі і захады групы дзеячаў, якія адышлі ад ТБШ пасля яго расколу ў 1929 г. (Р. Астроўскі, А. Луцкевіч і інш.). Менавіта яны ва ўмовах рэпрэсій польскіх улад і сталінскага рэжыму адзіным шляхам лічылі пошук кампрамісаў. «Мы мусім напружыць нашы сілы ў кірунку нацыянальнай самаабароны і стварэння беларускіх культурных каштоўнасцей»[1]. Кантакты з польскім «санацыйным» рэжымам у вачах заходнебеларускай грамадскасці выглядалі «згодніцтвам». ТБШ адкідвала прапановы аб супрацоўніцтве з польскімі ўладамі і культурна-асветнымі арганізацыямі, бо лічыла гэта «стратай свайго нацыянальнага твару»[2].

З пачатку 30-х гадоў у гісторыі культурна-асветных арганізацый Заходняй Беларусі наступіў складаны і трагічны час. З-за рэпрэсій польскіх улад да восені 1932 г. засталося толькі 150 гурткоў ТБШ. Неаднаразова наладжваліся судовыя працэсы супраць кіраўніцтва таварыства. У такіх абставінах пазіцыя заходнебеларускага камуністычнага руху адносна нацыянальна-дэмакратычнай інтэлігенцыі, да якой прыклейваўся ярлык «нацыянал-фашысцкай», мела яскрава дэструктыўны характар. Велізарныя фізічныя і маральныя страты нанеслі рэпрэсіі супраць інтэлігенцыі, у тым ліку і заходнебеларускай, у БССР. На фоне затухання працы ТБШ ажыўленай выглядала дзейнасць БІГіК, аднак не была наладжана шырокая школьная кампанія. Агульны заняпад нацыянальна-вызваленчай барацьбы, жорсткія рэпрэсіі, памылкі асобных партый не дазволілі стварыць адзіны агульнанацыянальны фронт супраць паланізацыі.

Змены ў стратэгіі і тактыцы міжнароднага камуністычнага руху, якія знайшлі ўвасабленне ў рашэннях II з'езда КПЗБ, паспрыялі ажыўленню працы ТБШ. У рамках стварэння антыфашысцкага народнага фронту ТБШ і БІГіК правялі ў 1936 г. сумесную школьную акцыю, якой кіраваў агульны школьны сакратарыят. Быў дасягнуты некаторы поспех у Гродзенскім, Ваўкавыскім, Маладзечанскім і іншых паветах. Важна тое, што розныя палітычныя сілы ўсведамлялі рэальную небяспеку паланізацыі заходнебеларускага насельніцтва. Аднак захоўваліся ўзаемныя недаверлівыя адносіны ў ходзе сумеснай акцыі. Да супрацоўніцтва не далучалася Таварыства беларускай асветы, створанае А. Луцкевічам і іншымі ў 1932 г.

Пасля забароны польскімі ўладамі 2 снежня 1936 г. ТБШ і 4 снежня гэтага ж года БІГіК значна пашыраліся магчымасці для разгортвання паланізацыі. Страта беларусамі сваёй этнічнай адметнасці стала пытаннем бліжэйшай перспектывы.

---

[1] Беларускі звон. 1931. 7 ліп.

[2] Бюлетэнь ТБШ. 1932. 28 верас.